Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Зарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Пасведчанне № 691 ад 25.09.2009 г.
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## прабЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ

"У дапамогу педагогу"
Серыя

№ 4 (94)' 2010

РЭПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

Мікалай Іосіфавіч МІНІЦКІ — галоўны рэдактар, *доктар гістарычных навук, прафесар*

У. В. ТУГАЙ — першы намеснік галоўнага рэдактара, *доктар гістарычных навук, прафесар*
Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара, *кандыдат гістарычных навук*
Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар
І. І. БАГДАНОВІЧ, *кандыдат педагагічных навук*
С. В. ПАНОЎ, *кандыдат педагагічных навук*
С. М. ХОДЗІН, *кандыдат гістарычных навук*
В. М. ВАРАНОВІЧ
Л. У. ЖЭРКА

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

У. В. ТУГАЙ — старшыня рэдакцыйнай рады
М. М. ЗАБАЎСКІ, *доктар гістарычных навук, прафесар*
А. А. КАВАЛЕНЯ, *доктар гістарычных навук, прафесар*
В. А. КАПРАНАВА, *доктар педагагічных навук, прафесар*
І. В. КАРПЕНКА
Г. А. КОСМАЧ, *доктар гістарычных навук, прафесар*
У. С. КОШАЛЕЎ, *доктар гістарычных навук, прафесар*
М. С. СТАШКЕВІЧ, *доктар гістарычных навук, прафесар*
В. М. ФАМІН, *доктар гістарычных навук, прафесар*
І. І. ЦЫРКУН, *доктар педагагічных навук, прафесар*
С. М. ХОДЗІН, *кандыдат гістарычных навук*



Заснавальнік і выдавец —
РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск; тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу), факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by, http://www.aiv.by

## Да 65-годдзя Вялікай Перамогі

# ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА — НАЗАЎСЁДЫ Ў ПАМЯЦІ НАРОДА

*Аляксандр Каваленя, доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

***Кожны народ мае свае святыні, якімі ганарыцца і якія шануюць новыя пакаленні. Для нас, беларусаў, безумоўнай святыняй з'яўляецца памяць аб тых, хто ў гады суровых выпрабаванняў Вялікай Айчыннай вайны ахвяраваў жыццём за свабоду і незалежнасць нашай дзяржавы, самааддана змагаўся з германскімі агрэсарамі на франтах вайны, у радах партызан і падпольшчыкаў супрацьстаяў акупантам, ігнаруючы ўстаноўленыя імі парадкі на захопленай тэрыторыі, выхоўваў дзяцей, зберагаючы біялагічны патэнцыял нашага народа. Тут і боль, і смутак аб загінуўшых, і гонар за ратныя подзвігі тысяч суайчыннікаў, якія ўнеслі велізарны ўклад у Вялікую Перамогу, і разуменне той высакароднай справы, якую здзяйснялі нашы бацькі і дзяды.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вывучэнне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны накіравана на фарміраванне патрыятычных і грамадзянскіх якасцей падрастаючага пакалення. Настаўніку неабходна падкрэсліць, што Вялікая Перамога 1945 г. заклала асновы таго сусветнага ладу, які, нягледзячы на ўсе яго супярэчнасці, дазволіў пазбегнуць новага глабальнага ваеннага канфлікту і ў цэлым спрыяў руху чалавецтва да больш стабільнага, бяспечнага і гуманнага міру ў нашы дні. Сёння некаторыя аўтары, схільныя да пошуку сенсацый, спрабуюць давесці да свядомасці людзей, што Вялікая Айчынная вайна з'явілася супрацьстаяннем паміж двума крывавымі дыктатарамі — Гітлерам і Сталінам. Тым самым падтрымліваецца лжывы тэзіс аб узаемнай адказнасці Германіі і Савецкага Саюза за развязванне Другой сусветнай вайны. Маюцца сілы, якія пад выглядам пошукаў аб'ектыўнага асвятлення падзей вайны спрабуюць ажыццявіць рэвізію сусветнага ладу, што склаўся ў пасляваенны перыяд. Але ён, насуперак усяму, працягвае існаваць і ўплываць не толькі на постсавецкую, але і на еўрапейскую і сусветную геапалітыку ў XXI ст.

Маладое пакаленне павінна ведаць, што вайна для Савецкага Саюза была не толькі трагічнай старонкай, пра што распавядае «дэмакратычная» супольнасць, але і гераічнай ратнай працай. Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны напісана не толькі вялікімі бязвіннымі ахвярамі, але і гераічнасцю, мужнасцю і самаадданым змаганнем мільёнаў людзей на франтах, у шэрагах партызан, падполлі, працай у савецкім тыле. У цяжкіх умовах пачатковага перыяду вайны, маральнай і тэхнічнай перавагі германскага вермахта з'явіліся тысячы і тысячы першых герояў, якія здолелі не толькі спыніць германскі пераможны паход, але і самаахвярнай працай сарваць маланкавы націск немцаў на ўсход. Менавіта ўпартасць, мужнасць і самаадданасць савецкага салдата зрабілі тое, чаго не змаглі

ажыццявіць войскі «цывілізаваных» краін Еўропы.

Падзеі Вялікай Айчыннай вайны займаюць важнае месца ў гісторыі беларускага народа. Для Беларусі, якая страціла ў 1941–1945 гг. кожнага трэцяга жыхара, праца па вывучэнні і ўвекавечванні гераічнага подзвігу народа з'яўляецца справай дзяржаўнай палітыкі, якую мэтанакіравана рэалізуюць заканадаўчыя, дзяржаўныя і выканаўчыя органы ўлады, навуковыя і грамадскія аб'яднанні і арганізацыі.

Няма ў Беларусі такога месца, якое б ні стала месцам народнага подзвігу, здзейсненага ў перыяд шматлікіх войнаў, што пранесліся агністай віхурай па шматпакутнай беларускай зямлі. Ужо ў першыя пасляваенныя гады ўдзячныя нашчадкі апявалі славу герояў і стваралі духоўную памяць аб вайне, узводзілі Курганы Славы, мемарыяльныя комплексы, абеліскі, помнікі. У падножжы многіх з іх гарыць Вечны агонь, а ўдзячныя людзі ўскладаюць ля яго кветкі. Мемарыяльныя комплексы, брацкія магілы, абеліскі і помнікі, адлітыя з бронзы і высечаныя з каменю, апранутыя ў граніт, з імёнамі тых, хто не вярнуўся з палёў вайны, і безыменныя, усталяваныя на гарадскіх плошчах, у вёсках, парках, на перакрыжаваннях шашэйных дарог, на лясных палянах, — нямыя сведкі велічы подзвігу народа. Яны з'яўляюцца духоўнай сутнасцю жыцця нашага грамадства, адыгрываюць вызначальную ролю ў фарміраванні нацыянальнага гонару, патрыятычнай і нацыянальнай самасвядомасці людзей. Да вучняў і студэнтаў важна данесці думку, што гісторыяй свайго народа, заваяванай і выпакутаванай шматлікімі пакаленнямі, не толькі можна, але і неабходна ганарыцца.

Увекавечванне ратнага подзвігу абаронцаў Айчыны мае багатую гісторыю і абапіраецца на векавыя славянскія традыцыі, якія склаліся ў час няспыннай барацьбы нашых продкаў з іншаземнымі захопнікамі. Яно напоўнена глыбінным духоўным сэнсам, паважлівым стаўленнем да захавання памяці аб тых, хто загінуў, абараняючы родную зямлю. З даўніх часоў над пахаваннямі славянскіх ваяроў узводзілі курганы, такі феномен існуе і да нашых дзён. Воінскія курганы і мемарыялы — гэта помнікі ўсім героям і ахвярам войнаў, храмы гістарычнай памяці, створаныя для выхавання ў цяперашніх і будучых пакаленняў патрыятызму і пачуцця гонару за сваю Радзіму. Іх велічнасць і прыгажосць заклікаsuccessful аказваць эмацыянальнае ўздзеянне, звязваць мінулае і сучаснасць.

Настаўнік павінен звярнуць увагу вучняў на тое, што паважлівае стаўленне да загінуўшых абаронцаў Айчыны заўсёды лічылася абавязкам і справай гонару суайчыннікаў. Гэта ўнутраны духоўны стан людзей, прасякнуты ўдзячнай памяццю аб тых, хто коштам уласнага жыцця не дазволіў ворагу здзекавацца над сваім народам.

Уяўляецца актуальным нагадаць, што яшчэ напярэдадні вайны праведзена неабходная падрыхтоўчая работа і 15 сакавіка 1941 г. народны камісар абароны СССР С. К. Цімашэнка падпісаў загад № 138, які абвяшчаў «Палажэнне аб персанальным уліку страт і пахаванні загінуўшага асабістага складу Чырвонай арміі ў ваенны час». У прынятым дакуменце выразна вызначаліся сістэма ўліку страт на франтах, парадак пахавання загінуўшых, а таксама правілы паведамлення насельніцтву краіны пра лёс іх сваякоў — вайскоўцаў арміі [1, с. 17–24].

Такім чынам, да пачатку вайны камандныя структуры Чырвонай арміі мелі неабходныя дакументальныя загады, якімі абумоўліваўся парадак пахавання загінуўшых і ўвекавечання іх памяці. Вядома, у няпростых ваенных сітуацыях вайны строга выканаць усе патрабаванні, выкладзеныя ў дакуменце, было надзвычай цяжка, а часам і немагчыма. Тым не менш увекавечанне памяці загінуўшых у баях з германскімі агрэсарамі пачалося з першых дзён баявых дзеянняў. Вялікую ролю ў гэтым адыгралі загады Вярхоўнага галоўнакамандуючага, кожны з якіх заканчваўся словамі: «Вечная слава героям, загінуўшым у баях за волю і незалежнасць нашай Радзімы!» [2].

Выкладчык павінен звярнуць увагу слухачоў на тое, што ва ўмовах неспрыяльнага развіцця ваенных дзеянняў, калі войскі Чырвонай арміі неслі велізарныя страты, неабходна было прымаць меры, накіраваныя на ўмацаванне маральнага духу байцоў і камандзіраў. У сувязі з гэтым пахаванне загінуўшых воінаў рабілася значным фактарам захавання патрыятычнага настрою і ўмацавання маральных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лучшие сыны родной Советской Белоруссии, находящиеся в рядах доблестной Красной армии и в партизанских отрядах, покрыли себя неувядаемой славой, геройски сражаясь и отстаивая нашу землю, города и сёла от озверелого фашизма.

Имена героев-белорусов — Гастелло, Доватора, Талалихина, Сильницкого и других бойцов великой освободительной войны — вечно будут живы в памяти нашего народа. О подвигах их, о героях-богатырях будут сложены легенды, все народы будут воспевать о них песни, воздвигать монументы, прославляющие их великие дела.

Для увековечения памяти героев и их славы Союзы советских архитекторов и художников в порядке подготовительной работы проводят товарищеское соревнование на составление проекта-идеи памятника героям Отечественной войны» [1, с. 29–30].

Важна давесці да маладога пакалення, што прыведзеныя і іншыя прыклады пераканаўча сведчаць аб тым, што ваенна-палітычнае кіраўніцтва Савецкага Саюза і Беларусі разумела важнасць годнага стаўлення да загінуўшых абаронцаў Айчыны. Неабходна падкрэсліць, што не толькі глыбінны духоўны, псіхолага-генетычны і маральна-этычны бок праблемы вызначалі яе значнасць. На першы план выступалася палітычная значнасць пытання, якая ўзмацняла грамадзянскі абавязак да памяці загінуўшых у баях за Радзіму. Нават у найцяжэйшых умовах вайны, калі вяліся напружаныя баявыя дзеянні на фронце, працягвалася барацьба на акупіраванай тэрыторыі, прымаліся рашэнні, накіраваныя на падтрыманне векавых воінскіх традыцый і рытуалаў. Камандаванне вайсковых частак і падраздзяленняў Чырвонай арміі і партызанскіх фарміраванняў, наколькі дазвалялі баявыя ўмовы, імкнулася ажыццяўляць пахаванне загінуўшых у баях воінаў. Прадпрымаемыя меры садзейнічалі ўмацаванню маральнага і баявога духу байцоў і камандзіраў Чырвонай арміі, а таксама партызан і падпольшчыкаў, з'яўляліся важным фактарам яднання народа і войска і ўмацавання аўтарытэту ўлады. Праўда, у найцяжэйшых умовах вядзення баявых дзеянняў не заўсёды была магчымасць арганізаваць годнае пахаванне. Здаралася, што і хаваць загінуўшых не было каму.

Асноўная праца па ўвекавечанні падзей Вялікай Айчыннай вайны і яе герояў разгарнулася пасля Вялікай Перамогі. Тэрыторыя Беларусі, якая з'яўлялася арэнай кровапралітных баёў і масавага народнага супраціўлення германскім захопнікам, стала месцам апошняга спачыну многіх абаронцаў. Ні адна краіна Еўропы і былога СССР не перажыла такой трагедыі, якую вынес беларускі народ. За гады Другой сусветнай вайны, самай багатай на чалавечыя ахвяры за ўсю гісторыю чалавечай цывілізацыі, на беларускай зямлі загінулі каля 3 млн чалавек. Нават пасля перапахавання воінаў і партызан з асобных магіл у брацкія ў першыя гады пасля вызвалення Беларусі адбывалася велізарная праца па годным увекавечанні абаронцаў Айчыны.

У красавіку 1950 г. камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі С. К. Цімашэнка і начальнік штаба БВА Н. Д. Захватаеў падрыхтавалі на імя сакратара ЦК КП(б)Б М. І. Гусарава і старшыні Савета Міністраў БССР А. Я. Кляшчова інфармацыйную запіску «О благоустройстве могил воинов Советской армии и партизан, погибших в период Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. на территории Белорусской ССР». У прадстаўленым дакуменце была прааналізавана дзейнасць савецкіх, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па добраўпарадкаванні і прывядзенні ў парадак воінскіх пахаванняў. Да гэтага часу на ўліку мясцовых улад знаходзілася 723 ваенныя, 9435 брацкіх і 15 266 асобных магіл. У гэты складаны пасляваенны перыяд з дзяржаўнага бюджэту былі выдзелены сродкі, на якія ўсталявана 55 фундаментальных помнікаў на ваенных могілках, 527 — на брацкіх, 365 — на асобных магілах [1, с. 65].

У выніку абследавання былі выяўлены шматлікія факты абыякавага стаўлення да памяці загінуўшых воінаў у Гомельскай, Віцебскай, Палескай, Магілёўскай і Маладзечанскай абласцях. Напрыклад, у Камарынскім, Даманавіцкім, Васілевіцкім, Тураўскім раёнах Палескай вобласці праца па добраўпарадкаванні брацкіх і асобных пахаванняў у 1948–1949 гг. не праводзілася. «Места, где расположены братские и индивидуальные могилы погибших воинов Советской армии в этих районах, превращаются в пастбища для скота и запахива-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лучшие сыны родной Советской Белоруссии, находящиеся в рядах доблестной Красной армии и в партизанских отрядах, покрыли себя неувядаемой славой, геройски сражаясь и отстаивая нашу землю, города и сёла от озверелого фашизма.

Имена героев-белорусов — Гастелло, Доватора, Талалихина, Сильницкого и других бойцов великой освободительной войны — вечно будут живы в памяти нашего народа. О подвигах их, о героях-богатырях будут сложены легенды, все народы будут воспевать о них песни, воздвигать монументы, прославляющие их великие дела.

Для увековечения памяти героев и их славы Союзы советских архитекторов и художников в порядке подготовительной работы проводят товарищеское соревнование на составление проекта-идеи памятника героям Отечественной войны» [1, с. 29–30].

Важна давесці да маладога пакалення, што прыведзеныя і іншыя прыклады пераканаўча сведчаць аб тым, што ваенна-палітычнае кіраўніцтва Савецкага Саюза і Беларусі разумела важнасць годнага стаўлення да загінуўшых абаронцаў Айчыны. Неабходна падкрэсліць, што не толькі глыбінны духоўны, псіхолага-генетычны і маральна-этычны бок праблемы вызначалі яе значнасць. На першы план выступалася палітычная значнасць пытання, якая ўзмацняла грамадзянскі абавязак да памяці загінуўшых у баях за Радзіму. Нават у найцяжэйшых умовах вайны, калі вяліся напружаныя баявыя дзеянні на фронце, працягвалася барацьба на акупіраванай тэрыторыі, прымаліся рашэнні, накіраваныя на падтрыманне векавых воінскіх традыцый і рытуалаў. Камандаванне вайсковых частак і падраздзяленняў Чырвонай арміі і партызанскіх фарміраванняў, наколькі дазвалялі баявыя ўмовы, імкнулася ажыццяўляць пахаванне загінуўшых у баях воінаў. Прадпрымаемыя меры садзейнічалі ўмацаванню маральнага і баявога духу байцоў і камандзіраў Чырвонай арміі, а таксама партызан і падпольшчыкаў, з'яўляліся важным фактарам яднання народа і войска і ўмацавання аўтарытэту ўлады. Праўда, у найцяжэйшых умовах вядзення баявых дзеянняў не заўсёды была магчымасць арганізаваць годнае пахаванне. Здаралася, што і хаваць загінуўшых не было каму.

Асноўная праца па ўвекавечанні падзей Вялікай Айчыннай вайны і яе герояў разгарнулася пасля Вялікай Перамогі. Тэрыторыя Беларусі, якая з'яўлялася арэнай кровапралітных баёў і масавага народнага супраціўлення германскім захопнікам, стала месцам апошняга спачыну многіх абаронцаў. Ні адна краіна Еўропы і былога СССР не перажыла такой трагедыі, якую вынес беларускі народ. За гады Другой сусветнай вайны, самай багатай на чалавечыя ахвяры за ўсю гісторыю чалавечай цывілізацыі, на беларускай зямлі загінулі каля 3 млн чалавек. Нават пасля перапахавання воінаў і партызан з асобных магіл у брацкія ў першыя гады пасля вызвалення Беларусі адбывалася велізарная праца па годным увекавечанні абаронцаў Айчыны.

У красавіку 1950 г. камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі С. К. Цімашэнка і начальнік штаба БВА Н. Д. Захватаеў падрыхтавалі на імя сакратара ЦК КП(б)Б М. І. Гусарава і старшыні Савета Міністраў БССР А. Я. Кляшчова інфармацыйную запіску «О благоустройстве могил воинов Советской армии и партизан, погибших в период Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. на территории Белорусской ССР». У прадстаўленым дакуменце была прааналізавана дзейнасць савецкіх, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па добраўпарадкаванні і прывядзенні ў парадак воінскіх пахаванняў. Да гэтага часу на ўліку мясцовых улад знаходзілася 723 ваенныя, 9435 брацкіх і 15 266 асобных магіл. У гэты складаны пасляваенны перыяд з дзяржаўнага бюджэту былі выдзелены сродкі, на якія ўсталявана 55 фундаментальных помнікаў на ваенных могілках, 527 — на брацкіх, 365 — на асобных магілах [1, с. 65].

У выніку абследавання былі выяўлены шматлікія факты абыякавага стаўлення да памяці загінуўшых воінаў у Гомельскай, Віцебскай, Палескай, Магілёўскай і Маладзечанскай абласцях. Напрыклад, у Камарынскім, Даманавіцкім, Васілевіцкім, Тураўскім раёнах Палескай вобласці праца па добраўпарадкаванні брацкіх і асобных пахаванняў у 1948–1949 гг. не праводзілася. «Места, где расположены братские и индивидуальные могилы погибших воинов Советской армии в этих районах, превращаются в пастбища для скота и запахива-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якія так і не адрадзіліся, былі прывезены ўрны з зямлёй. Тут і створаны сімвалічны могільнік. Побач з ім знаходзіцца Сцяна скрухі — жалезабетонны блок з нішамі, у якіх змешчаны мемарыяльныя пліты з назвамі 66 найбуйнейшых лагераў смерці і месцаў масавай гібелі людзей.

Завяршае мемарыял плошча Памяці. У цэнтры яе растуць тры бярозы, якія сімвалізуюць жыццё, на месцы чацвёртай — Вечны агонь. Побач знаходзіцца Дрэва жыцця са спісам 433 вёсак, спаленых акупантамі і адроджаных пасля вайны.

Грамадская і навуковая цікавасць да хатынскай трагедыі не знікае з цягам часу. За гады існавання мемарыяльнага комплексу «Хатынь» яго наведалі звыш 36 млн чалавек больш чым са 100 краін свету. У апошнія гады з'явіўся шэраг новых публікацый, створаны дакументальныя фільмы, якія настаўнік можа параіць вучням для падрыхтоўкі рэфератаў [3]. Выдадзены зборнік, які ўшаноўвае жыхароў Беларусі, загінуўшых у гады вайны. У яго ўключаны 150 арыгінальных дакументаў з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі, Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, а таксама з шэрагу іншых архіваў.

Брэсцкую крэпасць-герой справядліва завуць універсітэтам мужнасці. Велічны мемарыял быў адкрыты 25 верасня 1971 г. Ён увекавечыў гераічнасць і мужнасць абаронцаў цытадэлі і жыхароў у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны. Кампазіцыйным цэнтрам ансамбля з'яўляецца манумент «Мужнасць» — нагрудная скульптура воіна вышынёй 33,5 м і штык-абеліск вышынёй 104,5 м, які сімвалізуе перамогу над ворагам і вечную славу гераічным абаронцам крэпасці.

Аднымі з першых удар германскіх агрэсараў прынялі на сябе воіны-пагранічнікі і абаронцы Брэсцкай крэпасці. З 22 чэрвеня 1941 г. Брэсцкая крэпасць і горад Брэст былі падвергнуты масіраваным бамбардзіроўкам. Цалкам або часткова былі знішчаны склады з боепрыпасамі, вадаправод, парушаны камунікацыі і сувязь. Асабісты склад крэпасці ў выніку імгненнага нападу быў падзелены на некалькі частак. На што заставалася спадзявацца пагранічнікам, іх сем'ям, абслугоўваючаму персаналу Брэсцкай крэпасці? Здацца германскім агрэсарам і, магчыма, застацца ў жывых? Да канца выканаць свой абавязак перад Радзімай і аказаць супраціўленне ворагу?

Сённяшняй моладзі цяжка ўявіць, што адчувалі абаронцы крэпасці, якія ўступілі ў няроўны бой з ворагам летам 1941 г. Поўная блакада, недахоп боепрыпасаў, харчу, вады і медыкаментаў, пераўзыходзячыя сілы ворага, іх упэўненасць у сіле германскага вермахта, які забяспечыў «еўрапейскі бліцкрыг». У гэтых складаных умовах абаронцы Брэсцкай крэпасці не мелі вялікага выбару. Але ён быў зроблены на карысць выканання воінскага абавязку і адданасці Радзіме. Гераічнае супраціўленне падраздзяленняў 6-й і 42-й стралковых дывізій, 17-га пагранатрада і 132-га канвойнага батальёна войскаў НКУС было зламана толькі пасля іх гібелі. Да апошняга патрона людзі стрымлівалі націск ворага.

Нават праціўнік быў прасякнуты павагай да ўстойлівасці і мужнасці савецкіх салдатаў і афіцэраў. Ва ўспамінах нямецкага гісторыка, былога афіцэра ў штабе Блюментрыта Паўля Карэлла падзеі абароны Брэсцкай крэпасці прадстаўлены празмерна натуралістычна. «Весь фронт над Бугом, насколько хватало глаз, полыхал и содрогался от взрывов. Всё уничтожается артналётом и бомбардировкой. Канонада подняла на ноги гарнизон Брестской крепости. Батальоны двух полков нашей дивизии ринулись в атаку, но ворваться внутрь крепости не смогли — защитники её стояли насмерть; огонь стрелков и пулемётчиков не давал подняться. Во второй половине дня на помощь штурмовикам бросили резервный полк дивизии. Тщетно! Далее на подмогу был брошен дивизион штурмовых орудий. "Самоходки" в упор расстреливали позиции русских. Безрезультатно! К вечеру потери наши составили 21 офицер и 230 унтер-офицеров и солдат. Не добившиеся успеха штурмовые роты были отведены на исходные позиции. Теперь только применяли авиацию и артиллерию. Крепость стояла! 29 июня фельдмаршал авиации Кессельринг приказал бомбить и бомбить. Но бомбы в 500 килограммов не помогли. Стали бросать весом в 1800 килограммов. Стены рушились, кирпич плавился, но защитники стояли. Ни один не сдался в плен! 30 июня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Наши потери: 40 офицеров и 482 унтер-офицера и солдата, более 1000 раненых, большинство из которых вскоре скончались. Борьба продолжалась, позиции русских, здания казарм пришлось шаг за шагом подрывать по частям. А ещё в канун нападения никому в голову не могло прийти, сколько нашей крови прольётся здесь у старой крепости» (А. Сабов. «Российская газета»).

Адной з драматычных старонак абароны Брэсцкай крэпасці быў востры недахоп вады, так неабходнай для параненых, жанчын і дзяцей — усіх удзельнікаў абароны, а таксама для астуджэння кулямётаў. Захопнікі днём і ўначы ахоўвалі подступы да ракі Мухавец, асвятляючы іх пражэктарамі і абстрэльваючы прылеглую тэрыторыю. Стваральнікі мемарыяла зрабілі скульптурную кампазіцыю «Смага». Постаць салдата, які паўзе да вады з каскай у руцэ, не пакідае нікога раўнадушным. Сёння ў гэту каску экскурсанты кладуць жывыя кветкі.

У архівах захоўваюцца дзесяткі дакументаў, якія афіцыйна пацвярджаюць гераічную абарону Брэсцкай крэпасці. Эмацыянальна і пранікнёна ўздзейнічаюць на людзей надпісы, пакінутыя абаронцамі цытадэлі на яе сценах: «Умрём, но не уйдём!», «Нас было трое, нам было трудно, но мы не пали духом и умрём как герои», «Умрём, но не уйдём отсюда!», «Я умираю, но не сдаюсь. Прощай, Родина! 20.VII.41 г.». Пакінутыя на памяць нашчадкам надпісы на сценах Брэсцкай крэпасці з'яўляюцца вечным напамінам пра мужнасць, адвагу, адданасць Айчыне і свайму народу.

Рэльефныя кампазіцыі Брэсцкай крэпасці-героя адлюстроўваюць гераічныя эпізоды яе абароны. З цэнтральным манументам арганічна звязаны трыбуна і трох'ярусны некропаль. Пад ім — прах 962 загінуўшых у цытадэлі, на плітах — імёны 269 абаронцаў крэпасці і членаў іх сем'яў. Астатнія названы «невядомымі». Побач з руінамі былога інжынернага ўпраўлення гарыць Вечны агонь Славы. Перад ім адлітыя з бронзы словы: «Стояли насмерть, слава героям!». Вечны агонь быў запалены ў дзень адкрыцця мемарыяла 9 мая 1985 г. Героем Савецкага Саюза, першым сакратаром ЦК КПБ Пятром Міронавічам Машэравым. Недалёка ад Вечнага агню знаходзіцца Мемарыяльная пляцоўка гарадоў-герояў, на якой пад гранітнымі плітамі ўсталяваны капсулы з зямлёй з усіх гарадоў-герояў былога Савецкага Саюза [4].

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. Увековечивание памяти защитников Отечества и жертв войн Беларуси 1941–2008 гг.: документы и материалы. — Минск, 2008.
2. Приказы Верховного главнокомандующего в период Великой Отечественной войны Советского Союза: сборник. — М., 1975.
3. *Адамовіч, А.* Хатынская аповесць / А. Адамовіч. — Мінск, 2004; *Андрушчанка, М. К.* Хатынь / М. К. Андрушчанка.— Мінск, 1969; *Адамовіч, А.* Я з вогненнай вёскі / А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік. — Мінск, 1983; *Андрющенко, Н.* Хатынь / Н. Андрющенко. — Минск, 1969; *Бялевіч, А. П.* Хатынь: боль і гнеў / А. П. Бялевіч. — Мінск, 1971; *Каган, М. Е.* Стон колоколов Хатыни: стихи / М. Е. Каган. — Брянск, 2004; *Кобец-Філімонава, А.* Жаваранкі над Хатынню: аповесць / А. Кобец-Філімонава. — Мінск, 1973; *Кобец-Филимонова, Е.* Распятая Хатынь: повесть-эссе / Е. Кобец-Филимонова. — Минск, 2005; *Нагнібеда, М.* Званы Хатыні: паэма / М. Нагнібеда. — Мінск, 1973; Слухайце — Хатынь! : зб. вершаў савец. і замеж. паэтаў / уклад. А. Бачыла. — Мінск, 1975; Хатынь. — Мінск, 1978; Хатынь : альбом. — Минск, 1988; Хатынь. Мемарыял ахвярам фашызму : альбом. — Мінск, 1973; Хатынь : альбом. — Минск, 1988; Хатынь. Мемарыял ахвярам фашызму : альбом. — Мінск, 1973; Хатынь: Путеводитель по мемориальному комплексу. — Минск, 1981; Хатынь: Путеводитель по мемориалу. — Минск, 1985, 1986, 1987; Хатынь : фотоальбом. — Минск, 1976, 1978, 1982, 1998, 2002; Хатынь: дзяржаўны мемарыяльны комплекс : фотаальбом. — Мінск, 2005; Хатынь. — Минск, 2007; Хатынь: к 40-летию мемориальных комплексов «Хатынь» и «Курган Славы». — Минск, 2008; Хатынь: трагедия и память: документы и материалы. — Минск, 2009.
4. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945 : энцыклапедыя. — Мінск : БелСЭ, 1990.


*Заканчэнне ў наступным нумары.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ